Роўз Лагеркранц • Эва Эрыксан

# Маё шчаслівае жыццё



# Маё шчаслівае жыццё



тэкст:

Роўз Лагеркранц

ілюстрацыі:

Эва Эрыксан

KOSKA,

Мінск
Кандрусевіч Надзея
2019

УДК 821.113.6-93
ББК 84(4 Шве)-44
Л14

Пераклад са шведскай
*Надзі Кандрусевіч*

Пераклад зроблены паводле выдання:
ROSE LAGERCRANTZ • EVA ERIKSSON
*«MITT LYCKLIGA LIV»*
Bonnier Carlsen Bokförlag, Stockholm, 2017

The translation of this book was supported
by the Swedish Arts Council
SWEDISH
**ARTS**COUNCIL

**Лагеркранц**, Р.
Л14 Маё шчаслівае жыццё / Роўз Лагеркранц ; мастак Эва Эрыксан ; пер. са швед. Надзі Кандрусевіч. – Мінск : ІП Кандрусевіч Надзея, 2019. – 144 с. : іл.

ISBN 978-985-90452-9-5

Дзюнэ самая шчаслівая дзяўчынка на свеце. Асабліва калі яна ідзе ў школу. Як цудоўна ўсё пачынаецца! У Дзюнэ з'яўляецца сяброўка!
Але здараецца штосьці, чаго Дзюнэ не чакае. А пасля яшчэ і яшчэ...

УДК 821.113.6-93
ББК 84(4 Шве)-44

ISBN 978-985-90452-9-5

© Rose Lagercrantz, тэкст, 2010
© Eva Eriksson, ілюстрацыі, 2010
© Bonnier Carlsen Bokförlag, 2017
© Надзя Кандрусевіч, пераклад на бел. мову, 2019
© Выданне на бел. мове. ІП Кандрусевіч Надзея, 2019

Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў
*«Кнігарня пісьменніка».*
Заснаваная ў 2009 годзе.

Падсерыя *«Каляровы ровар»*.
Заснаваная ў 2013 годзе.

Выпуск 31



# ЗМЕСТ








Частка 1 ........................ 11

Частка 2 ........................ 15

Частка 3 ........................ 19

Частка 4 ........................ 25

Частка 5 ........................ 33

Частка 6 ........................ 41

Частка 7 ........................ 51

Частка 8 ........................ 57

Частка 9 ........................ 63

Частка 10 ...................... 67

Частка 11 ........ 73

Частка 12 ........ 79

Частка 13 ........ 91

Частка 14 ........ 97

Частка 15 ........ 107

Частка 16 ........ 111

Частка 17 ........ 115

Частка 18 ........ 123

Частка 19 ........ 131

Частка 20 ........ 135









# Частка 1



Ужо позна, але Дзюнэ не можа заснуць.

Калі дзеці не могуць заснуць, яны звычайна пачынаюць лічыць авечак, але толькі не Дзюнэ!

Дзюнэ лічыць, колькі разоў яна была шчаслівая.



Прыкладам, калі яна маленькая
і яе стрыечны брат Свантэ дорыць ёй жабку.

Ці калі яна ўпершыню праплывае

тры грабкі і не тоне.



Ці калі ёй дараць школьны заплечнік.

Дзюнэ такая шчаслівая, што пойдзе ў першы клас, яна чакае гэтага ўсё сваё жыццё!

Але гэтае лета цягнецца так доўга — пэўна, таму, што Дзюнэ так моцна чакае школы.



# Частка 2



Але калі нарэшце надыходзіць час ісці ў школу,

Дзюнэ задумваецца, што яе там чакае.

Яна проста будзе сядзець і вучыцца чытаць і пісаць?

Дык яна гэта і так ужо ўмее. Ну, ва ўсялякім разе, крыху — яшчэ з мінулага года.

— Ты думаеш, мне спадабаецца мая настаўніца? — пытаецца Дзюнэ ў таты.

— Вядома, — адказвае тата. — Вядома, спадабаецца.

— А ты думаеш, мне спадабаюцца мае аднакласнікі?

Дзюнэ хадзіла на падрыхтоўчыя заняткі ў іншую школу, а ў новай школе не ведае нікога.

Раптам ёй стала вельмі-вельмі страшна.

А што, калі яна ні з кім не пасябруе?



Калі так атрымаецца, яна больш ніколі туды не пойдзе, задумала сабе Дзюнэ.

«Ну ўсё, тата, трымай за мяне кулачкі!» — просіць яна, уваходзячы ў школьныя дзверы.

# Частка 3

Перад дзвярыма ў клас стаіць настаўніца і вітае дзяцей.



Але адзін хлопчык не хоча заходзіць.

Тады яго мама дае яму дваццаць крон, і ён згаджаецца хадзіць у школу.



Калі ўсе сабраліся ў класе, настаўніца кажа:

— Вітаю вас усіх у школе, сёння ваш першы дзень!

Потым яна па чарзе называе імёны дзяцей.

Тыя, хто не баіцца, падымаюць руку і кажуць «я». Дзюнэ таксама адказвае, хаця ёй здаецца, што яшчэ трошкі — і яна страціць прытомнасць.

Потым настаўніца раздае ўсім каляровыя крэйды і аркушы паперы, на якіх трэба напісаць свае імёны.

Дзюнэ насамрэч завуць Даніэла, але яна піша «Дзюнэ».

Дзяўчынка, якую завуць Мікаэла, піша «Мікі».

Хлопчык Эрык піша «Метэборг».

А Юнатан піша проста «Юнатан».

Усе змаглі напісаць свае імёны, акрамя аднаго хлопчыка. Яму дапамагла настаўніца.

І вось калі ўсім нарэшце становіцца весела, ужо трэба ісці дадому.





Увечары яны адзначаюць першы школьны дзень усёй сям'ёй.

Сям'я Дзюнэ — гэта Дзюнэ, тата і Кот.

Кот, напэўна, думае, што Дзюнэ ўжо дарослая, бо пайшла ў першы клас.

— Мне было зусім не страшна, — распавядае Дзюнэ Кату, — ну, можа, крыху хвалявалася, але насамрэч было вельмі класна!



Але сяброў у яе пакуль што няма.

# Частка 4

Наступнага дня Дзюнэ стаіць пасярод школьнага двара.

Увесь першы перапынак яна глядзіць, як гуляюць іншыя дзеці.



На наступным перапынку яна заўважае яшчэ адну дзяўчынку, якая гэтаксама ж стаіць і азіраецца.





Раптам яны глядзяць адна на адну, і Дзюнэ наважваецца падысці:

— Можа, пагушкаемся на арэлях?

Дзяўчынка ківае. Яе завуць Эла-Фрыда.





Яны гушкаюцца, пакуль не звініць званок.

І на іншых перапынках таксама.



Калі заняткі заканчваюцца, яны застаюцца,

каб пагушкацца яшчэ.



Ім зусім не хочацца спыняцца.

Але прыходзіць настаўніца і кажа, што ім час ісці дадому:

— Вы зможаце яшчэ пагушкацца заўтра.

У рэшце рэшт яны разыходзяцца па дамах.



# Частка 5



У школе Дзюнэ шчаслівая.

Ёй падабаецца гушкацца на арэлях з Элай-Фрыдай.

Ёй падабаецца сядзець у пакоі для гульняў і маляваць, як заходзіць сонца.

Ім з Элай-Фрыдай падабаюцца заходы сонца.



Дзюнэ шчаслівая, калі настаўніца дазваляе ёй і Эле-Фрыдзе сесці за адну парту.

Адзінае, што не падабаецца Дзюнэ, дык гэта што ім не даюць хатняга задання.



— У першы тыдзень хатніх заданняў не будзе, — кажа настаўніца.

Але Дзюнэ так хочацца займацца дома, што тата сам прыдумляе для яе хатнія заданні.





Дзюнэ шчаслівая, калі настаўніца дазваляе ім з Элай-Фрыдай сядзець побач і ў сталоўцы.

Яны ядуць шмат хлябцоў з супам.

Дзюнэ выбірае трыкутнічкі, а Эла-Фрыда — квадрацікі.



Калі на фізкультуры ім трэба выбраць сабе пару, яны, вядома, становяцца побач.

Аднойчы яны ідуць на пікнік на гару побач са школай. Спачатку яны любуюцца наваколлем, а потым ядуць бутэрброды і п’юць гарбатку і какаву. А пасля Эла-Фрыда дастае сюрпрыз.

Маленькую скрынку, дзе ляжаць два ланцужкі. На кожным з іх — палова сардэчка.

— Гэта ланцужкі нашага сяброўства, — тлумачыць Эла-Фрыда.

Яны надзяваюць ланцужкі, і Дзюнэ зноў вельмі шчаслівая.

Ах, якая ж яна шчаслівая!



Дзюнэ шчаслівая, калі яна прыходзіць у госці да Элы-Фрыды і гуляе з яе марской свінкай, якую завуць Пацібой.

І з малодшай сястрычкай Элы-Фрыды — Мірандай.

— Я зая! — крычыць Міранда, калі злуецца.

Яна мае на ўвазе «злая», але думае, што гэта вымаўляецца «зая»!



# Частка 6

Дзюнэ шчаслівая, калі Эла-Фрыда прыходзіць да яе і застаецца начаваць.

Яны засноўваюць Начны клуб.

Гэта клуб, які пачынаецца а дзясятай вечара і працягваецца колькі заўгодна.

Можна размаўляць, свяціць ліхтарыкам пад коўдрай і есці начны сняданак. Бутэрброды з сырам і гурком.

Калі стамляешся, то можна проста гладзіць спінкі адна адной, пакуль не заснеш.



Дзюнэ шчаслівая кожны раз, калі яны ладзяць НК.

НК — гэта такое скарачэнне для Начнога клуба.



А яшчэ Дзюнэ шчаслівая, калі яны ідуць з Элай-Фрыдай у краму, дзе прадаюць жывёл і дзе раней жыў Пацібой.

Там жывуць дзве іншыя марскія свінкі, таксама вельмі мілыя і прыгожанькія. І белыя, нібыта сняжынкі.

Таму Дзюнэ з Элай-Фрыдай вырашаюць, што адну будуць зваць Сняжок, а другую Сняжынка.

— Запытайся ў таты, можа, ён дазволіць табе іх набыць, — прапануе Эла-Фрыда.

Калі Дзюнэ пытаецца ў таты, ён маўчыць.

Дзюнэ лічыць, што, калі тата не адказвае, гэта жахліва.

І яна вельмі засмучаецца.



Але ўжо праз некалькі хвілін яна зноў шчаслівая. Ці, можа, гадзін. Ці дзён.

Яна дакладна не памятае, бо яна так часта бывае шчаслівая.

Дастаткова, каб Эла-Фрыда запыталася, ці будуць яны мяняцца закладкамі для кніг.

Эла-Фрыда згодная мяняцца якімі заўгодна закладкамі, акрамя адной. Гэта закладка-анёлак бабулі Элы-Фрыды. Яна захавалася яшчэ з таго часу, калі яе бабуля была маленькай дзяўчынкай.

Дзюнэ прапаноўвае за яе дзве свае найлепшыя закладкі, але Эла-Фрыда ўсё адно не пагаджаецца.

Тады Дзюнэ прапаноўвае тры, чатыры, пяць! Усе закладкі, што ў яе ёсць!

Але Эла-Фрыда адмаўляецца мяняць бабулінага анёлка.





Яны нават пасварыліся праз гэта.



Часам такое здараецца — яны сварацца.

Але не надоўга. Ужо праз некалькі хвілін яны зноў міракцца.

Бо немагчыма ўявіць сабе лепшай сяброўкі, чым Эла-Фрыда. Яны разам і ў дождж, і ў спёку, і ў агні, і ў вадзе.



# Частка 7




У школе бывае тыдзень садавіны і тыдзень гародніны.

Тады вучаць усё пра садавіну і ўсё пра гародніну.

Таксама, вядома, бываюць

і калядныя вакацыі.



На Каляды Дзюнэ разам з татам і Катом едуць да бабулі і дзядулі. Там усе атрымліваюць падарункі.

Дзюнэ адчыняе свае падарункі і доўга гуляе з кудлатым белым мядзведзікам, але хутка пачынае сумаваць па Эле-Фрыдзе.

Калі зноў пачынаецца школа, Дзюнэ шчаслівая.
Іх чакаюць сырны, масляны і малочны тыдні.
І яны малююць кароў.

Дзюнэ малюе чырвоную карову з вялікімі рагамі.

А Эла-Фрыда нічога не малюе. Яна сядзіць і закрывае вочы рукамі.



— Што здарылася? — шэпча Дзюнэ. — Ты плачаш?

Але Эла-Фрыда не адказвае.

Тады настаўніца распавядае Дзюнэ,
што Эла-Фрыда пераязджае жыць у іншае месца.

Калі Дзюнэ чуе гэта, яна таксама пачынае плакаць. Яна плача і плача, але гэта не дапамагае.



# Частка 8



Дзюнэ ляжыць у сваім ложку і лічыць усе разы, калі яна была шчаслівая, але ў яе нічога не атрымліваецца.

Эла-Фрыда больш не вучыцца ў іх класе, і Дзюнэ зусім не шчаслівая.

Яна вельмі нешчаслівая.

Яна таксама хоча пераехаць з Элай-Фрыдай.

Але застаецца жыць у сваім доме.






На вуліцы Хумлевэген.

Яна жыве тут усё сваё жыццё.

З татам і Катом.

У жоўтым доме.

Тым, што стаіць бліжэй да горкі,

з якой зімой так класна катацца на санках.



Раней у Дзюнэ была мама, якая таксама жыла разам з імі, але яна «пайшла».

Так кажуць дарослыя, калі нехта памірае.

Кажуць, што «яна пайшла з жыцця», хаця яна ўжо не можа хадзіць.

І куды пайшла? Дзе тое месца?



А цяпер і Элы-Фрыды няма.
Але яна не пайшла.

Яна з’ехала на машыне. У Нарчопінг.

Гэта горад за некалькі тысяч вуліц
і дарог ад Хумлевэген.

За некалькі тысяч лясоў, палёў,
лугоў і азёр…

Недзе там, дзе ўсе гэтыя тысячы лясоў, палёў,
лугоў і азёр, жыве цяпер лепшая сяброўка
Дзюнэ Эла-Фрыда.

# Частка 9

На наступны дзень пасля таго, як Эла-Фрыда пераехала, Дзюнэ проста сядзіць, утаропіўшыся ў яе пустое крэсла.





У той жа дзень яна падае на школьным двары, ірве калготкі і разбівае калена.

Ёй вельмі балюча. І яна будзе памятаць гэта заўжды.

Аж да трыццаці пяці гадоў, ну ці нешта такое.



Настаўніца наляпляе на калена маленькі кавалачак пластыру, але гэта не дапамагае. Пластыр увесь час адляпляецца.

А Дзюнэ плача.

Але не таму,
што балюча.

А таму што
з'ехала Эла-Фрыда.



# Частка 10

Дзюнэ плача і на наступны дзень.

Калі яны гуляюць у футбол...



...і калі Юнатан пхае яе так моцна,



што яна падае і робіць сабе дзірку ў галаве.



Тата мусіць ехаць з Дзюнэ ў бальніцу,
дзе ёй зашываюць дзірку і забінтоўваюць
галаву.





Але Дзюнэ плача не праз гэта.

Дзюнэ плача таму, што яна больш не шчаслівая.

# Частка 11

Потым ідзе хлебны тыдзень, і яны вучаць усё пра хлеб.

Але Дзюнэ зусім нецікава.



Аднойчы яны вяртаюцца з татам дадому і тата пытаецца, ці Дзюнэ па-ранейшаму хоча марскіх свінак.

Тады яна зноў становіцца трошкі шчаслівай.

Але раптам іх ужо прадалі?



Калі яны заходзяць у краму, Дзюнэ адразу ж бяжыць да марскіх свінак.



І Сняжок, і Сняжынка на месцы — такія ж мілыя і прыгожыя, як і мінулым разам.

Прадавачка перасаджвае марскіх свінак у скрыню і аддае Дзюнэ.

Тата набывае клетку, два дамкі, вітаміны, сена, два паільнікі і дзве місачкі для ежы.



Калі яны вяртаюцца дадому, Дзюнэ ўладкоўвае клетку. Цяпер у Сняжка і Сняжынкі ўтульныя дамкі. Яны залазяць туды і паварочваюцца да Дзюнэ спінкамі.



Марскія свінкі так робяць, калі хочуць, каб іх пакінулі ў спакоі.

А калі яны злуюцца, то скрыгочуць зубкамі.

А калі яны шчаслівыя, у іх блішчаць вочкі і яны вурчаць.

А калі ім страшна, яны могуць абсікацца. І абкакацца таксама.

Але насамрэч какаюць яны амаль увесь час, нават калі ім зусім не страшна.

# Частка 12



Дзюнэ — самы шчаслівы чалавек на свеце. Але не заўжды. Пасля таго як Эла-Фрыда пераехала, ёй сумна на перапынках.

Тады яна проста сядзіць у пакоі для гульняў і назірае, як хлопчыкі будуюць горад з лега і драўляных кубікаў.



Яны будуюць гэты горад ужо некалькі дзён, не дазваляючы дзяўчынкам удзельнічаць.

Дзяўчынкі вельмі злуюцца.





Калі горад ужо збудаваны, дзяўчынка Мікі выпадкова кранае вежу.

А дзяўчынка Вікі — замак.



А Дзюнэ ўстае і — уяві сабе! — паслізгваецца і пляскаецца проста пасярод збудаванага горада.

Проста нейкі землятрус!

Хлопчыкі пачынаюць крычаць і кідаць кубікі ў дзяўчынак!





А дзяўчынкі — у хлопчыкаў!

І пачалося!

Дзюнэ моцна пхае Юнатана, ён валіцца на падлогу і б’ецца тварам.

У яго ідзе кроў.



Прыбягае настаўніца. Спачатку ёй падаецца, што кроў цячэ з носа, але хутка яна заўважае, што пярэднія зубы Юнатана хістаюцца, ледзь не выпадаюць.

— Бяжыце па медсястру! — крычыць яна Мікі і Вікі.

Дзюнэ не памятае, што адбываецца потым. Ёй страшна глядзець, яна хаваецца пад сталом.



# Частка 13



Пасля гэтага Дзюнэ ўжо не шчаслівая ніводнай секунды.

Вечарам тата ідзе на нейкае свята, і да Дзюнэ прыходзіць прабабуля.

Раней Дзюнэ была б вельмі шчаслівая.

Яе старэнькая прабабуля вельмі мілая і гатуе найсмачнейшыя прысмакі ў свеце — любімую страву Дзюнэ макароны з кетчупам.

Але гэтым вечарам Дзюнэ не можа есці.

Яна думае пра тое, што пхнула Юнатана так, што той ледзь не страціў пярэднія зубы.

Яна думае пра гэта ўвесь вечар. Толькі калі яны пачынаюць глядзець фільм, Дзюнэ забываецца пра гэта на хвілінку і выпівае глыток вады са шклянкі, што стаіць на стале.



Але раптам яна адчувае нешта цвёрдае ў роце.

Бабуліна штучная сківіца!

Бабуля часта дастае яе, бо яна трохі муляе.



Пасля гэтага Дзюнэ не можа думаць ні пра што, апроч гэтых штучных зубоў.

А што, калі ў Юнатана цяпер будуць такія ж?

І ва ўсім вінаватая яна!

Што ж ёй цяпер рабіць?

У рэшце рэшт яна вырашае напісаць Юнатану ліст.

ПРЫВІТАННЕ, ЮНАТАН!
Я НЕ ХАЦЕЛА ПХАЦЬ ЦЯБЕ ТАК МОЦНА.
ПРАБАЧ.
ДЗЮНЭ.

P. S.
КАЛІ ТАБЕ ТРЭБА БУДЗЕ НАСІЦЬ ШТУЧНЫЯ ЗУБЫ І ЯНЫ БУДУЦЬ МУЛЯЦЬ, ТЫ ЗАЎЖДЫ ЗМОЖАШ ЗНЯЦЬ ІХ
І ПАКЛАСЦІ Ў ШКЛЯНКУ З ВАДОЙ.

# Частка 14




На наступны дзень Дзюнэ спрабуе аддаць ліст Юнатану.

Але ён не звяртае на яе ўвагі.

Яму паставілі брэкеты, і ў яго новы ровар — BMX.

Гэта такі ровар, на якім можна ўздымацца, нібы на кані.

Больш нічога асаблівага ў ім няма.

Нават багажніка няма.





Неўзабаве Юнатан кідае свой ровар
і пачынае гуляць у шарыкі.

Тады Дзюнэ зноў спрабуе аддаць яму ліст.




UMBE
ONE



Але Юнатан бярэ ліст толькі пасля таго, як выйграе ў шарыкі тры разы. Тады ён чытае ліст і ківае Дзюнэ:

— Мне не спатрэбяцца штучныя. У мяне хутка вырастуць новыя.

Дзюнэ зноў шчаслівая!

Пазней, калі Мікі і Вікі клічуць яе паскакаць праз скакалку, яна становіцца яшчэ шчаслівейшай!

Дзюнэ скача праз скакалку лепш за ўсіх.

У той дзень яна скача ажно пяцьсот разоў запар!

Увесь клас стаіць ды назірае за ёй.



# Частка 15

Потым надыходзіць тыдзень бульбы.

Яны вывучаюць усё пра бульбу.

А пасля заняткаў яны разам з Вікі і Мікі ідуць збіраць пустыя бляшанкі ды бутэлькі.



Яны знаходзяць шмат.



А потым ідуць у краму, здаюць іх і на зароб-
леныя грошы набываюць сабе жуйку.

Дзюнэ і Юнатан пачынаюць спаборніцтва — хто назбірае больш налепак. Такіх, якія налепліваюць на яблыкі ці бананы.

Яны наклейваюць іх на адваротны бок чырвонага дывана ў пакоі для гульняў.



# Частка 16

Цяпер кожны дзень у школе пачынаецца з таго, што дзеці запісваюць штосьці пра сябе ў адмысловых сшытках.

Сшытак Дзюнэ мае назву:

МАЁ ШЧАСЛІВАЕ ЖЫЦЦЁ.

Вось што яна там піша:

Мяне завуць Даніэла, але ўсе завуць мяне Дзюнэ.

У мяне светлыя валасы, залаціста-жоўтыя. Светла-залаціста-жоўтыя.

У мяне блакітныя вочы. Мая любімая страва — макароны з кетчупам, і я была шчаслівая шмат разоў у сваім жыцці.

Больш яна пакуль нічога не запісвае.



Але ўсё ў гэтым апавяданні — праўда.

Калі яна была маленькая, яна была шчаслівая амаль заўжды.

Напрыклад, таму, што мае пальчыкі на руках і нагах.



Ёй вельмі падабаліся яе ножкі.

І жывоцік таксама — такі мяккі і цёплы.

А яшчэ ў яе была мама.

Але потым мама захварэла, і яе паклалі
ў бальніцу.
Часам яе адпускалі дадому. Тады яна ўвесь
час сядзела на верандзе і адпачывала.

Дзюнэ ў асноўным жыла ў бабулі з дзядулем.

Аднойчы ўвечары пазваніў тата і сказаў,
што мама пайшла.
Дзюнэ была такая маленькая,
што не зразумела, што гэта значыць.

Пазней бабуля ёй патлумачыла, што так
толькі кажуць.
Мама не пайшла. У яе выраслі крылы,
і яна адляцела.

# Частка 17

Тата таксама лятае, але на самалёце. У Італію.

І Дзюнэ заўсёды лятае разам з ім, таму што там жыве яшчэ адна бабуля — татава мама.

Яны лятаюць туды кожнае лета.

Лепш за ўсё з гэтых паездак яна памятае, як яна сядзіць на вазку для багажа — на самым версе высачэзнай гары з валізак!

Раптам увесь стос абрынаецца,
але тата падскоквае і ловіць яе.
Тата ўвесь час ратуе яе!

Што б яна рабіла без яго?
Як жа ёй шанцуе, што ў яе ёсць тата!



Яшчэ аднаго разу ў Італіі яна падае

і драпае рукі, калені і нос.

У рэстарацыі.





Усе навокал вельмі шкадуюць яе і прыносяць вялікі шакаладны торт.

Дзюнэ частуе ім усю сям'ю.





Потым яна гуляе разам са сваім стрыечным братам Аляксандрам. А калі яны стамляюцца, то сядаюць і пачынаюць размаўляць.

Дзюнэ гаворыць па-шведску, а Аляксандр — па-італьянску.

— Ф’ёрэ, — кажа Аляксандр. — Гэта значыць «кветка».

— Аморэ, — працягвае ён. — Гэта значыць «каханне».

Дзюнэ ведае гэтае слова — яе тата ўвесь час яго паўтарае.

# Частка 18



— Аморэ, — кажа тата, калі зазірае да яе ў пакой. — Ты яшчэ не спіш?

— Не, — адказвае Дзюнэ. — Не магу заснуць.

Звычайна яна засынае, як толькі кладзе галаву на падушку, але тым вечарам Дзюнэ не можа нават заплюшчыць вочы.

— Што ж рабіць? — пытаецца тата. — Ты галодная?

— Так, — адказвае Дзюнэ. — Трошкі.

Яна чула, што некаторых дзяцей трэба карміць уначы. Можа, яе таксама?

Тата дае ёй шклянку малака з мёдам.



Сняжок і Сняжынка таксама не спяць і глядзяць на Дзюнэ. Ім цікава, што будзе далей.

— Аморэ, — шэпча Дзюнэ Сняжку.

Потым шэпча тое ж самае Сняжынцы:

— І ты таксама аморэ!

Ну дык што там яшчэ са шчасцем?

Так, сёння яна праскакала ажно пяцьсот разоў праз скакалку.

Гэта яе рэкорд.

Увесь клас стаяў і глядзеў на яе.

Дзюнэ была шчаслівая.

Але ў яе больш няма лепшай сяброўкі.

Толькі звычайныя сябры.

Напрыклад, Юнатан, Вікі ці Мікі.

Ці Метэборг. Ён ёй таксама падабаецца.

Дзюнэ ходзіць у вельмі добры клас, так кажа настаўніца тату.

Яны не валяцца з крэслаў і нічога такога.

Але яна забылася пра Бэні, таго хлопчыка, які не хацеў ісці ў школу, пакуль мама не дала яму дваццаць крон.



Аднойчы ён выслізнуў з класа і збег у краму па цукеркі.

А потым праслізнуў назад у клас.

Настаўніца заўважыла і сур'ёзна паразмаўляла з ім на перапынку.

Ніхто не ведае, што яна яму сказала, але гэта ўсё адно не дапамагло.

Бэні ўсё роўна трушчыць на ўроках цукеркі, хоць і нельга.

А часам ён поўзае па падлозе, нібы кракадзіл.

Усё канчаецца тым, што настаўніца садзіць яго за свой стол.



Цяпер — самае лепшае.

Дзюнэ пакідае гэта на самы канец. Ліст!

Аднойчы Дзюнэ атрымлівае ліст з Нарчопінга. Прачытаўшы яго, яна становіцца самай шчаслівай за ўсё жыццё.

Вось што ў тым лісце:

*Прывітанне, Дзюнэ!*
*Я не магу жыць без цябе.*
*Абдымаю,*
*Эла-Фрыда.*

А ў канверце ляжыць самая прыгожая закладка Элы-Фрыды — анёл.



# Частка 19

Дзюнэ адразу ж адказвае:

Прывітанне, Эла-Фрыда!

Пастарайся, калі ласка, дажыць,

пакуль мы не падрасцём.

Тады мы зможам жыць у адным горадзе,

у адным доме і працаваць на адной працы.

Мы зможам працаваць у адной краме.

Ці лячыць хворых жывёл у Афрыцы.

Ці ў Аўстраліі.

Абдымаю,

Дзюнэ.

P. S. Можам жыць і ў Нарчопінгу.

Хутка прыходзіць адказ:

*Прывітанне, Дзюнэ!*
*Я не магу чакаць так доўга.*
*Ты зможаш прыехаць да мяне на велікодныя вакацыі?*
*Абдымаю,*
*Эла-Фрыда.*

А праз некалькі дзён мама Элы-Фрыды тэлефануе тату Дзюнэ і пытаецца, ці можна Дзюнэ прыехаць да іх у госці.

Заўтра Дзюнэ едзе.

О, як жа яна чакае гэтае заўтра!

Але ад яе жадання час не бяжыць хутчэй...

Сняжок і Сняжынка таксама едуць з Дзюнэ.

Нарэшце яны пазнаёмяцца з Пацібоем!



# Частка 20



Тата зноў зазірае ў пакой да Дзюнэ.

— Дзюнэ, ну што ты яшчэ там робіш? — уздыхае ён. — Бяжы хуценька ў ложак!

Тата таксама хоча спаць.

Заўтра тата сам вязе Дзюнэ да Элы-Фрыды.

— Я такая шчаслівая, што не магу заснуць, — скардзіцца Дзюнэ.

— Я ведаю, што рабіць, — кажа тата. — Калі палічыць авечак…

— Не-е, толькі не авечак, — хныкае Дзюнэ. — Гэта ж так сумна.

— Тады лічы ў адваротны бок, — прапаноўвае тата. — Напрыклад, ад 20 і назад.

— 20, 19, 18… — лічыць Дзюнэ, але гэта таксама не дапамагае.

Дзюнэ далічвае да 17, яна ўзгадвае адзін спосаб, якому яе навучыла стрыечная сястра Расана.

Трэба заплюшчыць вочы і ўявіць сабе, што ты спіш.

Тады засынаеш па-сапраўднаму.



Атрымалася!

Ужо праз хвілінку Дзюнэ спіць.

А калі яна прачнецца, будзе раніца, і яна паедзе ў Нарчопінг.

І ў шчаслівым жыцці Дзюнэ пачнецца новая частка.





6+

Літаратурна-мастацкае выданне

**Лагеркранц** Роўз

# Маё шчаслівае жыццё

*для дзяцей малодшага школьнага ўзросту*

Ілюстрацыі *Эвы Эрыксан*

Пераклад са шведскай *Надзі Кандрусевіч*

Адказны за выпуск Надзя Кандрусевіч
Рэдактар Дзмітры Плакс
Тэхнічны рэдактар Алег Глекаў
Карэктар Алена Спрытніч

Падпісана да друку 13.09.2019. Друк афсетны.
Наклад 1000 ас. Замова 1196.

Выдавец ІП Кандрусевіч Надзея Канстанцінаўна.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы
і распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/520 ад 11.08.2017.
Вул. Купалаўская, д. 11, в. Каралёў Стан, 223027, Мінскі раён, Мінская вобл.
Тэл. +375 29 509 14 16

Надрукавана ў ПУП «Джи энд Ди».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/36 ад 13.01.2014.
Вул. Бурдзейнага, 37-191, 220136, г. Мінск.

## *Пра Роўз Лагеркранц і Эву Эрыксан*

Роўз і Эва амаль аднаго ўзросту і працуюць з дзіцячымі кнігамі вельмі даўно, 30–40 гадоў, амаль усё сваё дарослае жыццё. Яны шмат разоў рабілі кнігі разам. Вось што кажа Роўз пра іх супрацу:

*«Я вырашаю напісаць гісторыю, да якой, магчыма, Эва захоча намаляваць ілюстрацыі. І тады пачынаецца самае цікавае! Калі я пішу, я ўвесь час думаю пра Эву, быццам бы мы прыдумляем гісторыю разам, хаця яна нават не ведае, што будзе кніга. Калі тэкст напісаны, мы сустракаемся, звычайна ў кавярні, і я чытаю ёй уголас, што ў мяне атрымалася. Яна вельмі ўважліва слухае. Потым яна ідзе дадому і пачынае сваю працу. Эва не паказвае мне малюнкі, пакуль не скончыць. Яе малюнкі заўсёды лепшыя, чым я сабе ўяўляю. І гэта робіць мяне шчаслівай!»*

Роўз і Эва разам стварылі некалькі кніг пра хлопчыка Метэборга, дзе таксама ёсць Дзюнэ. Але гэтая кніга пра саму Дзюнэ.



Дзюнэ самая шчаслівая дзяўчынка на свеце.
Асабліва калі яна ідзе ў школу.
Як цудоўна ўсё пачынаецца!
У Дзюнэ з'яўляецца сяброўка!
Але здараецца штосьці,
чаго Дзюнэ не чакае. А пасля яшчэ і яшчэ...



выдавецтва
KOSKA,

ISBN 978-985-90452-9-5

Лагеркранц • Эрыксан

# Маё шчаслівае жыццё